


# За плённую працу

**Ордэны, медалі і ганаровыя званні: дзяржаўных узнагарод удастоены 45 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. Сярод іх — пяць руплііўцаў на ніве культуры.**

Адпаведны Указ №79 Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 27 лютага. Згодна з дакументам, медалём “За працоўныя заслугі” ўзнагароджана начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама **Алена Клімовіч**.

Медалём Францыска Скарыны адзначаны заслугі генеральнага дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета **Кацярыны Дулавай**, рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **Наталлі Карчэўскай** і мастака-рэстаўратара аддзела навукова-фондавай работы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея **Юрыя Кегелева.**

Указам таксама прысвоены ганаровыя званні Рэспублікі Беларусь. Так, заслужаным артыстам стаў вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа **Пятро Ламан**.

Ордэны, медалі і ганаровыя званні прысвоены прадстаўнікам розных сфер дзейнасці за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, смеласць і рашучасць, праяўленыя пры выратаванні людзей, заслугі ў воінскай службе, ахове дзяржаўнай мяжы, барацьбе са злачыннасцю. Дзяржаўнымі ўзнагародамі адзначана праца тых, хто ўнеслі значны асабісты ўклад у рэалізацыю сацыяльна-эканамічнай палітыкі, ваенна-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, развіццё вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі і трактарабудавання. Сярод узнагароджаных таксама работнікі грамадзянскай авіяцыі і АПК, гандлю і грамадскага харчавання, аховы здароўя, адукацыі і спорту.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by